# "Арт-мажор" — Нясвіжу

**Лепшыя нумары калектываў**, **што існуюць на кафедрах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў**, **можна будзе пабачыць** 25 **мая на гала-канцэрце** XIX **Фестывалю мастацтваў** "**Арт-мажор**".

Пра пта паведаміў кархпаншнту "К" прарэктар па інавацыйнай дзейнасці і мастацкай творчасці БДУКІМ, старшыня мастацкага савета фэсту Канстанцін Рэмішэўскі.

— Кожны год савет ацэньвае канцэрты калектываў і выканаўцаў розных кафедр БДУКІМ, — дадае ён. — А гала-канцэрт гэтым разам аб'яднае лепшых творцаў адной тэмай, звязанай з нашай старадаўняй культурай і нацыянальнай спадчынай, якая гучыць як "Беларусь— краіна замкаў". Галоўны ж онс фестывалю ў тым, каб студэнты прайшлі на сцэне прафесійную школу...

Паводле папярэдняй праграмы, у свяце прымуць удзел лаўрэаты міжнародных конкурсаў і фестываляў: Беларускі народны аркестр "Светач", Маладзёжны эстрадна<імфанічны аркестр, Капэла беларускіх духавых інструментаў імя У.Грома "Гуды", вакальна-харэаграфічны ансамбль імя У.Грома "Гуды", Ансамбль кафедры харэаграфіі, Ганна Благава, Інга Кісялёва ды іншыя артысты і калектывы.

Заключны канцэрт адбудзецца ў Белдзяржфілармоніі, і гледачы адчуюць атмасферу свята яшчэ ў фае. Тут будуць знаходзіцца артысты ў стылізаваных касцюмах, у якіх кожны ахвотны зможа купіць спецыяльную манету—"добры грош". Сродкі ад продажу такіх "фошаў" пойдуць на рэканструкцыю галоўнай вежы Нясвіжскага палацава-паркавага ансамбля. А гледачы канцэрта набудуць пры дапамозе манеты керамічныя вырабы з выявамі гістарычных асоб XVI—XVIII стагоддзяў. Выстаўка-продаж птых вырабаў адбудзецца тут жа. Таксама будзе магчымасць зрабіць імгненнае фота з "гістарычнымі персанажамі", якіх прадставяць студэнты.

*Рэракцыя газеты "Культура" выказвае ўдзячнасць за дапамогу ў арганізацыі фотаздымак Нясвіжскага замка намесніку старшыні Нясвіжскага райвыканкама Міхаілу Афанасіку, дырэктару "Нясвіжскага зеленбуда" Юрыю Козічу. Здымкі адбываліся з аўтавышак ЗІЛ-ПАРТ-28 і ЗІЛ-ВС-22, якімі кіравалі машыністы Віталь Рымашэўскі і Дзяніс Драбязка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ